УДК 811.161.3'373.211.1

# Рэнамінацыя ўнутрыпаселішчных аб'ектаў: сутнасць, фактары, тыпы, прычыны, перыяды

**Мезенка Г.М.**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*У артыкуле разглядаюцца некаторыя праблемныя аспекты працэсу рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных аб'ектаў, выяўляюцца фактары, якія абумоўліваюць гэты працэс, падкрэсліваецца неабходнасць адрозніваць два тыпы рэнамінацыі – перайменаванне і аднаўленне былых назваў, вызначаюцца прыкметы, па якіх іх можна дыферэнцыраваць. Асаблівая ўвага надаецца прычынам і перыядам перайменаванняў.*

*Мэта даследавання – вызначэнне асаблівасцей працэсу рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных лінейных і тэрытарыяльных аб'ектаў.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам даследавання паслужылі дадзеныя Дзяржаўнага кадастравага агенцтва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці; метады – дэскрыптыўны, класіфікацыйны, супастаўляльны, элементы статыстычнага.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Сярод існуючых у наш час змен назваў унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў неабходна адрозніваць паміж сабой два розныя, хаця і нечым падобныя працэсы – перайменаванне і аднаўленне былых найменняў. Нягледзячы на тое, што назвы гэтых працэсаў маюць адзін і той жа сінонім (змена), яны значна адрозніваюцца зместава. Вылучаем некалькі прыкмет, па якіх іх можна дыферэнцыраваць, – колькасную і выніковую. Перайменаванні вуліц, завулкаў і іншых лінейных і тэрытарыяльных аб'ектаў унутры горада выразна падзяляюцца на два тыпы ў залежнасці ад таго, у выніку якой дзейнасці яны з'явіліся: 1) як вынік стыхійнай намінатыўнай дзейнасці, калі працуе фактар "прыроды рэаліі"; 2) як вынік валявых рашэнняў гарадскіх улад. Існавала тры разнавіднасці прычын, якія выклікалі перайменаванні другога тыпу. У развіцці беларускай урбананіміі было пяць актыўных перыядаў перайменаванняў.*

***Заключэнне.*** *Рэнамінацыю можна разглядаць як другасную намінацыю ўнутрыпаселішчнага аб'екта, якая, аднак, істотна адрозніваецца ад намінацыі як першаснага іменавання лінейных і тэрытарыяльных аб'ектаў. Іх адрозненне пацвярджаецца, у першую чаргу, тым, што вывучэнне працэсаў рэнамінацыі вылучае якасна новыя праблемы, якія не разглядаліся ў рамках тэорыі намінацыі.*

*Такім чынам, стварэнне тэорыі рэнамінацыі ўяўляецца адной з актуальных і перспектыўных задач сучаснай анамастыкі.*

***Ключавыя словы:*** *віконім, намінацыя, рэнамінацыя, унутрыпаселішчны аб'ект, сацыякультурныя рэаліі, урбанонім.*

*(Ученые записки. – 2020. – Том 31. – С. 168–171)*

# Renomination of Intra-Settlement Objects: Essence, Factors, Types, Causes, Periods

**Mezenka H.M.**
*Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*The article examines certain problematic aspects of the process of renaming intra-settlement objects, identifies the factors that determine this process, emphasizes the need to distinguish between two types of renaming – renaming and restoration of the former names, identifies features by which they can be differentiated. Particular attention is paid to the causes and periods of renaming.*

*The purpose of the study is to determine distinctive features of the process of renaming of intra-settlement linear and territorial objects.*

***Material and methods.*** *The study was based on data obtained from the State Cadastral Agency of the Republic of Belarus, the National Historical Archive of Belarus, the State Archives of Vitebsk Region; the following methods were used – descriptive, classification, comparative, elements of statistic method.*

***Findings and their discussion.*** *Among the current changes in the intra-city and intra-village objects, it is necessary to distinguish between the two different, although somewhat relatable, processes – renaming and restoration of the former*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mezenka1@yandex.ru –* ***Г.М. Мезенка***

*names. Despite the fact that the names of these processes have the same synonym (change), they differ significantly in content. We identify several signs by which they may be differentiated – quantitative and resultative. Renaming streets, alleys and other linear and territorial objects within the city is clearly divided into two types depending on the activity as a result of which they appeared: 1) as a result of spontaneous nominative activity, when the factor "nature of reality" works; 2) as a result of the willful decisions of the city authorities. There were three kinds of reasons that caused renaming of the second type. There were five active periods of renaming in the development of Belarusian urbanonymy.*

***Conclusion.*** *Renaming can be considered as a secondary nomination of an intra-settlement object, which, however, differs significantly from the nomination as a primary naming of linear and territorial objects. Their difference is confirmed, first of all, by the fact that the study of renaming processes highlights qualitatively new problems which have not been considered within the theory of nomination.*

*Thus, the creation of the theory of renaming is one of the crucial and promising tasks of modern onomastics.*

***Key words:*** *viconym, nomination, renaming, intra-settlement object, social and cultural realities, urbanonym.*

*(Scietific notes. – 2020. – Vol. 31. – P. 168–171)*

Развіццё лінгвістычнай навукі сёння абумоўлівае ўкараненне антрапалагічнай парадыгмы, якая прадугледжвае тлумачэнне моўных адзінак у сувязі з асобай іх носьбіта, яго духоўнай культурай, у даследаванні мовы. Рэалізацыя антрапалагічнай парадыгмы звязана найперш з этналінгвістыкай, анамастыкай, сацыялінгвістыкай – навукамі, галоўнае месца ў якіх займае карэляцыя мова – культура народа. Зварот да ўрбананімнага матэрыялу ў рамках адзначаных падыходаў да моўных фактаў мэтазгодны па розных прычынах: па-першае, таму, што ўрбанонімы захоўваюць у сабе культурную інфармацыю, а культурная інфармацыя замацоўваецца ва ўнутранай форме моўных адзінак; па-другое, назвы ўнутрыпаселішчных аб'ектаў забяспечваюць захаванасць традыцыйных мадэляў наймення; па-трэцяе, урбанонімы цесна звязаныя і з іншымі сферамі культуры доследнага рэгіёна.

Сучасныя лінгвістычныя тэорыі разглядаюць анамастычны тэкст як фрагмент нацыянальна-моўнай карціны свету, якая ўяўляе сабой "ментальную рэпрэзентацыю культуры" і адлюстроўвае спецыфіку яго ўспрымання і "карціравання" з улікам асаблівасцей мыслення прадстаўнікоў той ці іншай культуры.

Пэўную цікавасць з гэтага пункту гледжання ўяўляюць факты рэнамінацыі, пад якой часта разумеюць перайменаванне ўнутрыпаселішчных аб'ектаў, якія ўбудоўваюцца ў існуючы анамастыкон, становяцца часткай яго тапанімнай прасторы і ўносяць істотныя змены ў яго культурны фонд. Вывучэнне фактаў рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных аб'ектаў мае важнае значэнне для аналізу ўрбананіміі і радзей віканіміі, паколькі дазваляе прасачыць працэсы асваення пэўным урбананімiконам / віканіміконам іншай рэчаіснасці, выявіць дыялектыку катэгорый "сваё" – "іншае" ў гэтым працэсе, прасачыць спецыфіку адлюстравання ў анамастыконе, які прымае паняцці, што абазначаюць рэаліі і канстанты "іншай" культуры. Такім чынам, даследаванні, накіраваныя на аналіз асаблівасцей рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных аб'ектаў, знаходзяцца ў рэчышчы найноўшай парадыгмы мовазнаўства, арыентаванай на антрапацэнтрычны падыход да мовы.

Вывучэнне тэорыі пытання сведчыць аб тым, што сістэмнае апісанне спецыфікі рэнамінацыі ў анамастыцы да гэтага часу не было прадметам спецыяльнага разгляду.

Сказанае вышэй абумоўлівае актуальнасць дадзенага даследавання, якая пацвярджаецца адсутнасцю спецыяльных прац, накіраваных на сістэмнае вывучэнне анамастыконаў у аспекце тэорыі рэнамінацыі.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне асаблівасцей працэсу рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных лінейных і тэрытарыяльных аб'ектаў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі дадзеныя Дзяржаўнага кадастравага агенцтва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці; метады – дэскрыптыўны, класіфікацыйны, супастаўляльны, элементы статыстычнага.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Уяўляецца неабходным, перш чым пачаць размову пра рэнамінацыю, адзначыць, што сярод існуючых у наш час змен унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў трэба адрозніваць паміж сабой два падобныя працэсы – *перайменаванне* і *аднаўленне былых найменняў*. Нягледзячы на тое, што назвы гэтых працэсаў маюць адзін і той сінонім – змена, – яны значна разыходзяцца зместам.

Сутнасць *рэнамінацыі* ва ўрбананіміі заключаецца ў называнні ("адлюстраванні") "свайго" дэнатата сродкамі неіснуючага ("чужога") урбананімікона, у працэсе якога можа адбывацца некаторае пераўтварэнне (змяненне) тых уласцівасцей, на падставе якіх папярэднія назвы ўзніклі.

Сутнасць *аднаўлення былой назвы* зусім іншая і заключаецца ў адлюстраванні "свайго" дэнатата сродкамі "свайго", але парушанага ўрбананімікона. А вось вынікі гэтага працэсу вельмі падобныя на вынікі перайменавання, бо, па-першае, пры адраджэнні былой назвы звычайна не адбываецца вяртання ведаў пра тыя ўласцівасці, на падставе якіх яна ўзнікла; па-другое, былая назва праз пэўны адрэзак часу пачынае ўносіць істотныя змены ў культурны фонд сучаснага ўрбананімікона, перастае карэляваць з новымі.

Магчыма, менавіта таму так часта сустракаем неразборлівасць аўтараў публікацый у тэрмінах “перайменаванне” і “адраджэнне былой назвы” і перавагу ў выкарыстанні першага з іх.

На карысць спецыяльнага вывучэння рэнамінацыі гаворыць і актывізацыя ў пачатку XXI ст. пытанняў пра змену і адраджэнне старых найменняў. Пры гэтым, на жаль, ва ўсе часы абмеркаванне іх выклікала і выклікае залішнія эмоцыі. Актуальнымі ў гэтым сэнсе застаюцца словы расійскага гісторыка, культуролага, ганаровага члена Рускага геаграфічнага таварыства Г.А. Багуслаўскага, выказаныя ім у канцы 80-х гг. мінулага стагоддзя: “Сённяшняя павышаная грамадская цікавасць да пытанняў, якімі займаецца тапаніміка, адначасова і жыватворная, і небяспечная. У шырокае абмеркаванне пытанняў аб найменнях і перайменаваннях уносіцца занадта шмат эмоцый ... назіраецца тэндэнцыя да палітызацыі шэрага пытанняў, якія павінны вырашацца на навуковай аснове” [1, с. 3].

Гістарычна першым па часе сярод рэнамінацыйных працэсаў з’явілася *перайменаванне* геаграфічных аб’ектаў. З усіх існуючых класаў геаграфічных аб’ектаў перайменоўваліся культавыя будынкі, паселішчы [2] і асабліва вуліцы, завулкі і іншыя ўнутрыпаселішчныя аб’екты. Трэба адзначыць, што перайменаванні першага з пералічаных класаў аб’ектаў адбываліся вельмі рэдка, але менавіта яны аднымі з першых знайшлі пісьмовую фіксацыю ў дакументах. Што да перайменаванняў унутрыгарадскіх аб’ектаў Беларусі, то яны сустракаюцца ў дакументах, пачынаючы з XVIII ст. Зразумела, гэта не азначае, што да ўказанага часу ўнутрыгарадскія аб’екты не перайменоўваліся. Мяркуем, перайменаванні, якія спадарожнічаюць росту гарадоў, назіраліся заўсёды. Аднак характарызаваліся яны ў кожным з пазначаных класаў аб’ектаў адрознымі асаблівасцямі. Вылучым некалькі прыкмет, па якіх іх можна дыферэнцыраваць.

*Колькасная прыкмета*. Агульная колькасць замены назваў касцёлаў і цэркваў ні ў якое параўнанне з колькасцю перайменаваных вуліц і іншых лінейных аб’ектаў не ідзе. Пры гэтым працэнт іх палічыць немагчыма з-за частай змены на працягу гісторыі палітыка-адміністрацыйных і сацыякультурных рэалій на даследаванай тэрыторыі. Адзначым толькі, што змены назваў касцёлаў і цэркваў звычайна карэлявалі з унутры- і міжканфесійнымі перыпетыямі. Так, напрыклад, вядомы з XVII ст. у Магілёве *касцёл Успення Багародзіцы* ў 1782 г. быў перайменаваны ў *касцёл Св. Станіслава* [3, с. 513]. Наогул за чатыры папярэднія стагоддзі зафіксавана каля двух дзясяткаў такіх перайменаванняў, у той час як змены ўнутрырадскіх лінейных аб’ектаў толькі за адно XX стагоддзе і толькі ў адным горадзе Магілёве налічваюць каля 100 выпадкаў (гл.: [4]).

*Выніковая прыкмета*. Перайменаванні вуліц, завулкаў і іншых лінейных і тэрытарыяльных аб’ектаў унутры горада выразна падзяляюцца на два тыпы ў залежнасці ад таго, у выніку якой дзейнасці яны з’явіліся:

а) як вынік стыхійнай намінатыўнай дзейнасці (разбурэння гарадоў і вуліц у час войнаў, росту і змянення аблічча вуліц, узвядзення новых больш значных аб’ектаў на іх і да т.п., іншымі словамі, калі працуе фактар “прыроды рэаліі”, яе роля ва ўрбананімным кантэксце). Напрыклад, мінская *Зыбіцкая вуліца*, што сфарміравалася ў другой палове XVI–XVII ст. і атрымала назву ад асновы слова *зыбкая* ‘няўстойлівая, забалочаная’, у 1866 г. была перайменавана ў *Балотную вул.*, а ў 1882 г., калі яна ўжо была занята гандлёвымі крамамі, магазінамі, цырульнямі, – у *Гандлёвую вул.* [5];

б) як вынік валявых рашэнняў гарадскіх улад (магчымых разнастайных указаў, пастаноў, рашэнняў). Пачалі адбывацца ў сярэдзіне XIX ст.

Існавала тры разнавіднасці прычын, якія выклікалі перайменаванні гэтага тыпу. Першая прычына – наяўнасць аднолькавых назваў у розных раёнах горада. Напрыклад, у Віцебску ў другой палове XIX ст. былі перайменаваны дзве з *Пакроўскіх*, дзве з *Грязных*, тры з *Кавальскіх вуліц*. Пазней такая практыка выкарыстоўвалася і працягвае выкарыстоўвацца ў выпадках пашырэння тэрыторыі горада за кошт далучаных вёсак, якія мелі ў сваіх віканіміконах падобныя на існуючыя ў горадзе назвы вуліц. Другая прычына – змена статусу аб’екта, калі, напрыклад, вуліца ператвараецца ў праспект. Трэцяя прычына – ідэалагізацыя і палітызацыя беларускай урбананіміі, якая пачалася з 1918 г.

У развіцці беларускай урбананіміі было некалькі актыўных перыядаў перайменаванняў.

Першы з іх прыходзіцца на 1860-я гг., больш дакладна, на гады пасля падаўлення паўстання Кастуся Каліноўскага (1863–1864 гг.), калі пад змену падпадалі назвы, што мелі дачыненне да каталіцызму. Напрыклад, у Мінску ў гэтыя гады былая *Бернардзінская вуліца* набывае назву *Манастырская*, *Дамініканскую вуліцу* пачынаюць іменаваць *Петрапаўлаўскай*, *Францысканскую* – *Губернатарскай* і г.д.

Другі, звязаны з Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г., якая змяніла сацыяльную структуру грамадства і моцна паўплывала на ўрбананіміконы беларускіх гарадоў, прыходзіцца на 1920-я гады, калі асноўнай базай для перайменаванняў сталі прозвішчы асоб, што прымалі актыўны ўдзел ва ўсталяванні савецкай улады (*вул. Дзяржынскага*, *Валадарскага*, *Урыцкага* і інш.), кіраўнікоў пралетарыяту (*вул. Леніна*, *К. Маркса*, *Энгельса*, *Каменева* і інш.); лексіка, якая адлюстроўвае новыя сацыялістычныя адносіны, новы грамадскі лад (*Камуністычная*, *Сацыялістычная*, *Камунальная*, *Камсамольская*, *Піянерская вул.* і інш.).

Трэці пачаўся пасля Вялікай Айчыннай вайны і звязаны з імкненнем увекавечыць у памяці нашчадкаў падзеі Вялікай Айчыннай, імёны яе герояў. Вынік гэтага перыяду – вялікая колькасць мемарыяльных назваў, дадзеных у гонар Герояў Савецкага Саюза, вядо-

мых генералаў, радавых удзельнікаў вайны, вядомых партызан і падпольшчыкаў.

Чацвёрты і самы актыўны этап перайменаванняў унутрыгарадскіх аб’ектаў – 60–80-я гг. База перайменаванняў гэтага перыяду, з аднаго боку, падобная на базу папярэдняга, а з другога – больш арыентавана на прозвішчы дзяржаўных дзеячаў БССР і СССР, а таксама тых, хто прымаў актыўны ўдзел у вызваленні пэўнага горада, і ўраджэнцаў гэтых месцаў (мінскія *вуліцы Казлова* (да 1967 г. *Даўгабродская*), *Прытыцкага* (да 1971 г. *Ракаўская шаша*), *Сурганава* (да 1979 г. *Друкарская*), *праспект Машэрава* (да 1980 г. *Паркавая магістраль*, пракладзеная ў 1961-м), *вуліца Кісялёва* (да 1983 г. *Старажоўская*), у Мёрах *вуліцы Ермака*, *Ізварына*, у Талачыне – *вул. Жаўтухіна*, *Нарчыка*, *Смірнова*, у г.п. Ушачы – *вул. П. Броўкі* і г.д.).

На 90-я гг. прыпадае пачатак пятага – паслясавецкага перыяду. Сваёй базай ён падобны на чацвёрты, але адрозніваецца больш шырокім распаўсюджаннем пры перайменаваннях прозвішчаў прадстаўнікоў навукі, мастацтва і культуры – касманаўтаў-беларусаў, беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў, асветнікаў, акцёраў, кампазітараў.

Асаблівую ролю ў працэсе рэнамінацыі павінен адыгрываць “фактар рэнамінатара”. Выступаючы ў якасці суб’екта рэнамінацыі, рэнамінатар не толькі правільна ацэньвае сваё стаўленне да новай назвы аб’екта, але і магчымасці карыстальнікаў назвы ў адносінах да ўспрымання дадзенага наймення. Ён павінен вызначыць ступень вядомасці матывацыі жыхарам населенага пункта, ступень засвоенасці прапанаванай рэаліі. Неабходна адзначыць, што менавіта гэты фактар вельмі рэдка ўлічваўся пры рэалізацыі першага тыпу рэнамінацыі. Так, вынікі выбарачнага анкетавання сведчаць аб павярхоўным веданні маладымі жыхарамі Віцебска гісторыі роднага горада, захаванай у назвах вуліц, аб некаторай ілжывай прадвызначанасці ўспрымання мемарыяльных назваў, пры якой любая назва-прысвячэнне тлумачыцца як прысвоенае ў гонар рэвалюцыянера або ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

Рэзюмуючы выкладзенае, неабходна адзначыць, што аналізаваны тып рэнамінацыі ўнутрыгарадскіх аб’ектаў, асабліва пры празмерным яго выкарыстанні, вядзе да масавага знішчэння народнай урбананіміі, да сцірання індывідуальнасці гарадоў.

Што да другога тыпу рэнамінацыі – аднаўлення былых назваў, – то сутнасць, дынаміка дзеяння, фактары, што яго абумоўліваюць, і магчымасці будуць разгледжаны намі ў наступнай публікацыі. Цяпер толькі падкрэслім, што менавіта ён – той шлях, ідучы па якім, магчыма адрадзіць нацыянальную ўрбананімію.

**Заключэнне.** Такім чынам, працэс рэнамінацыі ўнутрыпаселішчных рэалій абумоўлены некалькімі фактарамі: а) фактарам “прыроды рэаліі” і яе ролі ва ўрбананімным ці віканімным кантэксце; б) “фактарам рэнамінатара”, які адлюстроўвае яго кагнітыўны багаж, яго стаўленне да апазіцыі “рэнамінатар – карыстальнік назвы” і абранай ім формы перадачы назвы; в) фактарам храналогіі з’яўлення новай назвы ў прымаючым урбананіміконе ці віканіміконе (найперш пры адраджэнні былых назваў).

У аснове працэсу рэнамінацыі павінны ляжаць характарыстыкі рэаліі (вуліцы, завулка, плошчы, будынка і інш.), якія адлюстроўваюць яе прыналежнасць да зыходнай або новай культурнай сітуацыі, асаблівасці яе функцыянавання ў новым кантэксце, а таксама яе эматыўныя характарыстыкі.

Выбар новай прапрыяльнай часткі для існуючага лінейнага ці тэрытарыяльнага аб’екта павінен быць зарыентаваны на галоўныя асаблівасці ўрбананімнага тэксту, захаванне яго нацыянальна-культурнай спецыфікі, а таксама на ўлік ролі дадзенай анамастычнай адзінкі ў пэўным урбананімным кантэксце. Стварэнне новай намінатыўнай адзінкі свядома ці несвядома павінна ацэньвацца рэнамінатарам з пункту гледжання яе ўспрымання адрасатамі.

Рэнамінацыю можна разглядаць як другасную намінацыю ўнутрыпаселішчнага аб’екта, якая, аднак, істотна адрозніваецца ад намінацыі як першаснага іменавання лінейных ці тэрытарыяльных аб’ектаў. Іх адрозненне пацвярджаецца, у першую чаргу, тым, што вывучэнне працэсаў рэнамінацыі вылучае якасна новыя праблемы, якія не разглядаліся ў рамках тэорыі намінацыі.

Такім чынам, стварэнне тэорыі рэнамінацыі ўяўляецца адной з актуальных і перспектыўных задач сучаснай анамастыкі.

## Літаратура


1. Богуславский, Г.А. Знания и эмоции / Г.А. Богуславский // Городские имена: Вчера и сегодня (Вопросы ленинградской топонимики): тез. докл. – Ленинград, 1989. – С. 3–4.
2. Кавалёва, А.В. Слоўнік назваў перайменаваных паселішчаў Беларусі / А.В. Кавалёва; пад рэд. В.В. Шура. – Мінск: Права і эканоміка, 2013. – 140 с.
3. Беларуская савецкая энцыклапедыя. – Мінск: БелСЭ. – 1972. – Т. 6. – 624 с.
4. Улицы Могилева: сто лет назад и сегодня [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://yandex.by/search/. – Дата доступу: 27.05.2020.
5. Зыбицкая улица [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступу: 28.05.2020.


*Паступіў у рэдакцыю 03.06.2020*